**Гісторыя культуры**

**Алег ТРУСАЎ**

# Мінулае і сучаснасць Лідскага замка



*ТРУСАЎ Алег Анатольевіч — дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1954 г. у Мсціславе. У 1976 г. закончыў гістарычны факультэт БДУ, у 1980 г. — аспірантуру Інстытута гісторыі АН БССР. У 1981 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Археологическое изучение памятников монументального зодчества XI—XVII вв. на территории Белоруссии (Методические исследования)». У 1991—1996 гг. — дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. З 1999 г. — старшыня Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны. Займаецца вывучэннем матэрыяльнай культуры Беларуси XI—XVIII стст. Аўтар больш за 500 навуковых і навукова-папулярных публікацый, у тым ліку манаграфій: Памятники монументального зодчества Белоруссии XI—XVII вв.: Архитектурно-археологический анализ (Мн., 1988); Беларуская кафля (Мн., 1989) (у сааўтарстве); Старонкі муранай кнігі: Манументальная архітэктура эпохі феадалізму і капіталізму (Мн., 1990); Манументальнае дойлідства Беларусі XI—XVIII стст.: Гісторыя будаўнічай тэхнікі (Мн., 2001).*

У XIII—XIV стст. беларускія землі ўвайшлі ў склад Вялікага княства Літоўскага. Утварэнне гэтай дзяржавы стала вынікам сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця часткі старажытнабеларускіх зямель (Гродзенскага, Наваградскага і Полацкага княстваў) і зямель усходнелітоўскіх плямён. Яно было значна паскорана існаваннем сур'ёзнай знешняй небяспекі з боку крыжакоў і татараў. Аб'яднанне ў адзіную дзяржаву адбывалася пераважна мірным шляхам.

Непасрэдная крыжацкая небяспека для беларускіх зямель існавала на працягу XIII—XIV стст. да 1410 г., калі аб'яднанае войска ВКЛ і Каралеўства Польскага нанесла паражэнне войскам Тэўтонскага ордэна пад Грунвальдам. Доўгі час пытанне абароны ад крыжакоў было адным з галоўных для ўлад ВКЛ. Крыжацкія набегі на беларускія землі пачасціліся ў канцы XIII—пачатку XIV ст. Існаваўшыя драўляныя ўмацаванні з муравanымі вежамі-стаўпамі ўжо не маглі стрымаць ворага. Таму ў першай палове XIV ст. у ВКЛ узнікае абарончая сістэма з магутных замкаў у Лідзе, Наваградку, Крэве, Медніках, Вільні і Троках. Гэта былі як старыя, спачатку драўляныя, а потым адбудаваныя з каменю і цэглы замкі-дзядзінцы, так і замкі новага тыпу — *кастэлі*.

У XIII—XIV стст. кастэлем у Заходняй Еўропе называлі невялікі мураваны замак, які звычайна меў адну ці дзве вежы і будаваўся ў нізіннай мясцовасці на штучным насыпе. Дойліды ВКЛ, узяўшы за ўзор заходнееўрапейскі тып замка — кастэль, прыстасавалі яго да мясцовых умоў. Яны значна павялічылі плошчу замкавага двара. Падчас небяспекі ў замку маглі знайсці прытулак не толькі войскі, але і мірнае насельніцтва.

Будаўніцтва Лідскага мураванага замка — аднаго з самых вялікіх на беларускіх землях (памеры двара складаюць прыблізна 80х80 м) — адбывалася ў 1330-я гг. Вялікім князем літоўскім у той час быў Гедзімін, які ўвайшоў у гісторыю як таленавіты палкаводзец, змагар супраць крыжакоў. Ён разумеў, што спыніць крыжакоў могуць толькі мураваныя замкі з моцнымі гарнізонамі. Таму, скарыстаўшы часовае перамір'е з Тэўтонскім ордэнам, вясной 1323 г. Гедзімін разаслаў лісты ў ганзейскія гарады, у якіх запрашаў на працу розных рамеснікаў, у тым ліку і муляроў. Некаторыя даследчыкі лічаць, што ганзейскія майстры прынялі непасрэдны ўдзел ва ўзвядзенні Лідскага замка.

Для будаўніцтва замка была абрана невялікая пясчаная выспа ў балоцістай сутоцы дзвюх рэк — Лідзеі і Каменкі. Выспу месцамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Лідскі замак у часы вялікага князя літоўскага Аляксандра.* Фотарэканструкцыя І.Пешахонава.

дасыпалі жвірам, камянямі, буйной рачной галькай да вышыні 5—6 м і надалі ёй прамавугольную форму. З поўначы, на адлегласці 7 м ад яе, праходзіў шырокі (каля 20 м) роў, які злучаў дзве ракі і аддзяляў замак ад горада.

Вядомы беларускі даследчык замкаў Міхась Ткачоў падлічыў, што для будаўніцтва Лідскага замка спатрэбілася каля 23 тыс. кубічных метраў каменю і каля 1,5 мільёна цаглін. Паводле розных пісьмовых крыніц, работы па яго ўзвядзенню вяліся ад 5 да 7 гадоў.

За некалькі год да пачатку ўзвядзення замка рабілі ямы для гашэння вапны. Пасля таго як вапна была падрыхтавана, а будаўнічая пляцоўка расчышчана, выкапалі равы пад падмурак. Магчыма, у XIV ст. яшчэ не надавалі належнай увагі стварэнню на мясцовасці дакладнага геаметрычна акрэсленага плана будучага замка, і таму замкавыя муры ніколі не ўтвараюць правільных геаметрычных фігур накшталт квадрата альбо прамавугольніка. Майстры, якія ўзводзілі Лідскі замак, памыліліся пры закладцы падмурка ўсходняй замкавай сцяны, і частка яго (гэта высветлілася падчас раскопак) не была скарыстана пры ўзвядзенні замка.

Равы для падмурку капалі драўлянымі рыдлёўкамі, краі якіх былі акаваны жалезам. Пакуль вяліся земляныя работы, прывозілі камяні для падмуркаў і сцен, пясок для рошчыны і абпаленую цэглу: яе складвалі штабялямі ў пэўным парадку.

У выкапаныя неглыбокія, каля метра, равы для падмурку клалі камяні вялікіх і сярэдніх памераў, перасыпалі іх пяском альбо глінай. Верхнія рады пралівалі вапнавай рошчынай. Затым пачыналі ўзводзіць сцены. Памочнікі падносілі мулярам камяні і цэглу, рошчыну ў драўляных начоўках, ваду ў цэбрах (таксама драўляных). Усё гэта падавалася наверх па лесвіцах і з дапамогай спецыяльных блокаў. У тоўшчу сцен для іх умацавання клалі драўляныя брусы.

Рыштаванні для будаўнікоў значна адрозніваліся ад сучасных. Яны мацаваліся да канцоў драўляных кансольных бэлек, якія закладаліся непасрэдна ў муроўку. Пасля заканчэння будаўніцтва бэлькі проста адразалі або вынімалі.

Лідскі замак пабудаваны з палявога каменю і цэглы. Таўшчыня сцен унізе — 2 м, уверсе — да 1,5 м. Уверсе сцены пераходзілі ў баявую галерэю, парапет якой таўшчынёй у 70 см, складзены з цэглы і мае адзін рад байніц. Насціл галерэі абапіраўся на драўляныя бэлькі сячэннем 20x20 см. На паўднёвай і ўсходняй сценах замка знаходзіліся два цагляныя данскеры (туалеты) на каменных фігурных кансолях.

Спачатку замак меў толькі адну вежу — у паўднёва-заходнім куце двара. У плане яна ўяўляла сабой квадрат (па ўнутранаму абводу амаль 9x9 м). Ад вежы засталіся толькі фрагменты падмуркаў.

РЕПОЗИТОРИЙ

Замак меў тры ўваходы. У паўднёвай сцяне на адлегласці 22 метры ад вежы знаходзіўся невялікі паўцыркульны праём на вышыні 4 метры ад першапачатковага ўзроўню двара. Гэты праём, відаць, выкарыстоўваўся як запасны (для разведкі або ўцёкаў). Трапіць туды або выйсці з замка можна было толькі з дапамогай доўгай прыстаўной альбо вяровачнай лесвіцы. Два ўваходы існавалі ва ўсходняй сцяне: малы, зроблены на ўзроўні абрэза падмуркаў сцяны, і вялікі (які, відаць, быў зроблены пазней), размешчаны каля паўночна-ўсходняй вежы на вышыні 2,5 м. Трапіць у замак праз вялікі ўваход можна было толькі па пад'ёмнаму масту. Пра яго наяўнасць сведчыць вялікая спічастая ніша, якую прыраза ў уваходны праём меншых памераў.

Праём малога ўваходу меў таксама паўцыркульную форму і вышыню 2,45 м. Захаваліся сляды ад бегункоў варот. Гэта два вялікія камяні ў аснове аркі з круглымі гнёздамі-адтулінамі. Знадворку малы ўваход абараняла падкавападобнае ў плане збудаванне, ад якога засталіся нязначныя рэшткі падмуркаў.

Вонкавыя паверхні замкавых муроў Лідскага замка зроблены з вялікіх, часткова абчасаных валуноў, што пакладзены гарызантальнымі, дакладна вызначанымі радамі. Камяні добра падагнаны адзін да аднаго. Прамежкі паміж імі запоўнены каменнымі аскалёпкамі на вапнавай рошчыне (цагляныя кліны сустракаюцца вельмі рэдка). Забутоўка паміж "шчокамі" сцен — з дробных камянёў. Цэгла выкарыстоўвалася толькі для асноўных канструктыўных элементаў і архітэктурных дэталей. З яе былі выкладзены вуглы замкавых муроў і вежаў, дэкаратыўныя паясы на фасадах усходняй і паўночнай сцен, аркі, скляпенні, байніцы і вонкавыя паверхні парапета баявой галерэі.

Цагляныя паясы знадворку замкавых сцен выкананы ў тэхніцы балтыйскай, або вендскай, муроўкі (чаргаванне двух альбо трох доўгіх бакоў цагліны і кароткага).

Муроўка выканана з цэглы двух тыпаў памерамі 31x15x10 см і 31x14x7 см. Вузейшыя цагліны выкарыстоўваліся толькі для абрамоўкі парапета баявой галерэі.

На аснове праведзеных археалагічных даследаванняў можна сцвярджаць, што ў першай палове XIV ст. існавала толькі паўночна-заходняя вежа замка, якая мела ахоўнае і жылое прызначэнне. Асноўны цяжар абароны прыходзіўся на муры з баявой галерэяй. У час ваеннай небяспекі каля байніц сталі воіны, узброеныя лукамі і арбалетамі (самастрэламі). Арбалеты з'явіліся на беларускіх землях у XIII ст. і шырока выкарыстоўваліся да пачатку XVI ст. Кароткая і цяжкая арбалетная страла ляцела на меншую адлегласць, чым лучная, але яе забойная сіла была значна большай: гранёныя цяжкія наканечнікі маглі прабіць браню цяжкаўзброеных рыцараў. Шмат розных па форме наканечнікаў лучных і арбалетных стрэл знойдзена ў Лідскім замку. У 1976 г. археолагі адшукалі і касцяны "арэх" — асноўную дэталь спускавога механізма самастрэла.

У канцы XIV—пачатку XV ст. вялікі князь літоўскі Вітаўт перабудаваў Лідскі замак і зрабіў яго адным з самых магутных у ВКЛ. Для ўмацавання замка была ўзведзена другая, паўночна-ўсходняя вежа, якая магла выкарыстоўвацца для вядзення гарматнага бою. Вежа была пабудавана з цэглы лепшай якасці і іншых памераў, чым сцены замка, — 29—30x14x7,5—8 см. Вежу прыбудавалі да муроў упрытык. Таўшчыня сцен, якія выходзілі ў двор, складала 3 м, а дакладкі да двухмятровых муроў замка, якія былі



*Паўночна-ўсходняя вежа і фрагмент усходняй сцяны замка.*
XV—XVI стст. Рэканструкцыя А.Трусава.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Абаронца Лідскага замка. XV—XVI стст.*
Рэканструкцыя У.Кіслага па матэрыялах раскопак А.Трусава.

зроблены для ўзмацнення сцен, — 83 см. Падмуркі вежы знаходзяцца на 70—80 см глыбей замкавых.

Першапачаткова вежа мела арачны дзвярны праём з двара, выкладзены са спецыяльнай фігурнай цэглы, і лесвіцу ў тоўшчы заходняй сцяны шырынёй 1 м з драўлянымі прыступкамі на цаглянай аснове. Паўночная і ўсходняя сцены вежы знутры маюць дзве нішы, а ў паўднёвай сцяне на першым паверсе захаваліся дзве глыбокія нішы-печы, што некалі ацяплялі верхнія памяшканні. Першы паверх меў крыжовае скляпенне, рэбры якога выкананы са стрэлападобнай цэглы.

Падчас раскопак двара высветлілася, што з трох бакоў (акрамя паўднёвага) да замкавых муроў прымыкалі драўляныя аднапавярховыя будынкі-казармы (захаваліся рэшткі іх падмуркаў, печаў і абгарэлых бярвенняў). Шырыня будынкаў складала каля 4 м. Непадалёку ад заходняй сцяны стаяў асобны будынак, дзе, верагодна, жыў са сваёй сям'ёй камендант замка (кашталян). Гэта было прамавугольнае ў плане збудаванне (6х4 м), з каменным падмуркам, пакладзеным на гліне. Яго памяшканні ацяпляліся кафлянай печкай.

Ва ўсходняй частцы двара знаходзіліся два калодзежы. Адзін, невялікіх памераў, непадалёку ад паўночна-ўсходняй вежы. Другі, вялікі, відаць, прызначаўся для таго, каб паіць жывёлу. Да яго вяла брукаваная сцежка. Пры правядзенні археалагічных раскопак былі выяўлены рэшткі драўляных калодзежных зрубаў. Сярэдзіна замкавага двара была таксама забрукавана. Каля паўднёва-ўсходняй вежы знаходзіліся кузня і салдацкая кухня.

Гістарычны лёс Лідскага замка быў надзвычай складаны. Упершыню пад замкавымі сценамі крыжакі з'явіліся ў 1384 г. Пасля працяглай аблогі і штурму яны захапілі замак. Наступны набег быў зроблены зімой 1392 г., калі балоты вакол умацавання скаваў лёд. Захопнікі спалілі навакольныя будынкі, абрабавалі горад і ўзялі замак у аблогу. Брат вялікага князя літоўскага Ягайлы Карыбут, які ў 1390 г. атрымаў у дзяржанне Ліду, знаходзіўся на той час у Лідскім замку. Ён меў нязначную колькасць воінаў і таму вырашыў не чакаць штурму. Ноччу праз патаемны ход разам з гарнізонам Карыбут пакінуў замак. Крыжакі занялі яго, захапілі шмат вайсковага рыштунку і зброі. Праз два гады крыжацкія атрады зноў напалі на Ліду, але на гэты раз замак выстаяў. Пры падтрымцы жыхароў горада воіны гарнізона мужна адбілі ўсе атакі непрыяцеля.

Сляды зацятых баёў з крыжакамі засталіся ў культурным слаі на замкавым двары і знешніх схілах муроў. Гэта тоўстыя праслойкі вугалю — сведкі пажараў, рэшткі рознай зброі, а таксама рыштунку конніка і збруі каня.

У 1977 г. у ваколіцах Ліды падчас меліярацыйных работ быў знойдзены кароткі лёгкі меч — корд — даўжынёй каля метра. Датуецца ён XV ст. На лязе мяча ёсць два кляймы: г.Пасау — "воўк" і крыжык на дузе. Хутчэй за ўсё меч паходзіць з Германіі, бо такія знакі, як пасаўскі "воўк", сустракаюцца на зброі з тагачасных нямецкіх гарадоў. Падобнае кляймо стаіць на мячы пскоўскага князя Даўмонта.

Непадалёку ад замка мясцовы жыхар на сваім агародзе адкапаў каваны кінжал даўжынёй 43 см. Круглая адтуліна ў верхняй частцы дзяржання кінжала сведчыць, што насілі яго на рамяні. Знаходка датавана XIV ст.

На замкавым двары знойдзены абламаны наканечнік дзіды ў конскім чэрапе, і ўток — металічная акоўка ніжняй часткі дрэўка дзіды. (Уток мацаваўся да дрэўка цвіком і дазваляў воіну пры неабходнасці лёгка ўваткнуць дзіду ў зямлю.)

Сведчаннем шматлікіх нападаў на Лідскі замак з'яўляецца і вялікая колькасць каменных ядраў з вапняку і граніту. Іх дыяметр вагаецца ад 7—9 да 34 см. Датуюцца ядры канцом XIV—сярэдзінай XVII ст. У асноўным яны гарматныя, але некаторыя, асабліва вялікіх памераў, маглі прызначацца і для каменямётаў, што былі на ўзбраенні воінаў да XV ст. Гарматы з'явіліся ў Беларусі ў XIV ст., і доўгі час з іх стралялі выключна каменнымі ядрамі.

Ціск крыжакоў на Панямонне рэзка ўзмацніўся ў канцы XIV ст. У 1393 г. яны разбурылі замкі ў Гродне, Мяркіне, Дзярэчыне і Лідзе. У чарговы раз яны з'явіліся пад Лідай у першай палове 1394 г. Магчыма, тады ў Лідскім замку і пачалося будаўніцтва другой вежы.

РЭПОЗІТОРЫЙ БДПУ




*Схема эвалюцыі Лідскай кафлі XIV—першай паловы XVII ст.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Некаторыя гісторыкі лічаць, што ў 1396—1398 гг. у Лідскім замку жыў саюзнік Вітаўта хан Залатой Арды Тахтамыш, выгнаны Цімурам. Магчыма, Вітаўт падрыхтаваў і ўмацаваў замак дадатковай вежай менавіта да яго прыезду.

Дасталося Лідскаму замку і падчас міжусобных войнаў. У пачатку XV ст. да яго сцен падышлі войскі смаленскага князя Юрыя Святаславіча, які хацеў вызваліць сваю сям'ю, захопленую ў палон Вітаўтам. Смаляне спалілі горад, некалькі разоў штурмавалі замак, але ўзяць яго не здолелі. У 1433 г. замак узялі ў аблогу войскі князя Свідрыгайлы, прэтэндэнта на велікакняжацкі прастол ВКЛ. Горад быў знішчаны полымем, але абаронцы замка мужна адбілі наступ захопнікаў.

У другой палавіне XV ст. замак часова знікае са старонак старажытных летапісаў і хронік. І гэта не дзіўна. Для Ліды надышлі адносна спакойныя часы. У гэты час Лідскі замак быў адным з самых вялікіх замкаў у ВКЛ. Таму невыпадкова вялікі князь літоўскі Аляксандр у 1506 г. вырашыў склікаць сойм ВКЛ у Лідзе. Ён, ужо цяжка хворы, прыехаў у Лідскі замак і там 24—25 чэрвеня склаў тэстамент, паводле якога ўся ўлада пасля яго смерці пераходзіла да яго малодшага брата Жыгімонта.

У маі 1506 г. адбыўся чарговы напад на ВКЛ крымскіх татараў. У першай палове чэрвеня іх войска стала лагерам у ваколіцах Клецка. Неўзабаве татарскія орды сталі набліжацца да Ліды. Вось што паведамляе пра тыя падзеі "Хроніка Быхаўца": "...У год 7015 ад пачатку свету, а ад Божага нараджэння 1507, пасля паланення зямлі Літоўскае бязбожнымі татарамі, прыехаў кароль і вялікі князь Аляксандр з Польшчы ў Вільню, вельмі хворы на немач паралітыкавую, і ўчыніў сойм у горадзе Лідзе. І калі быў ён з усімі панамі ў Лідзе, прыйшла яму вестка, што царэвічы перакопскія Бітыс-Гірэй-султан ды Бурнаш-султан прыйшлі з дваццаццю тысячамі людзей к Слуцку і ідуць пад Новаградок... Татары, прыйшоўшы да Новагарадка, неўзабаве пайшлі за Нёман, і, не даходзячы да Ліды, каля горада і за мілю ды за паўмілі ад горада нішчылі цэрквы Божыя ды двары вялікія, і

вёскі падпальвалі, і людзей хапалі ды забівалі...".

З-за небяспекі захопу Ліды вялікага князя Аляксандра, разам з жонкай Аленай Іванаўнай і дваром, давялося тэрмінова перавезці ў Вільню. Аднак штурмаваць умацаваны замак татары пабаяліся. У гэты час у Лідзе было сабрана паспалітае рушэнне колькасцю ў сем тысяч чалавек, якое на чале з князем Міхаілам Глінскім разбіла татараў пад Клецкам.

Што ж уяўлялі сабой горад і замак у XVI—XVII стст.? Сярэдневяковая Ліда — гэта замак, княжацкі двор, уласна горад з падзамкам і прадмесцем, што звалася Зарэчча.

Княжацкі двор у XVII ст. знаходзіўся за замкам каля рэчкі Каменка. Сам горад размяшчаўся толькі па адзін бок замка, на поўнач ад яго. У цэнтры быў рынак, адкуль бралі пачатак чатыры вуліцы. Віленская выходзіла на шлях да Вільні. Ад рынка ўздоўж замка праходзіла Замкавая вуліца, ад яе пачыналася Каменская, якая вяла да дарогі на мястэчка Васілішкі. Вуліца Крывая злучала рынак з Каменскай.

Жыхары Ліды па веравызнанню былі праваслаўнымі і каталікамі. Гісторык М.Шымялевіч паведамляе, што да 1553 г. у замкавай вежы знаходзілася праваслаўная царква, якую потым перанеслі ў горад. У 1579 г. была пабудавана сінагога, а затым і кальвінскі збор. У 1590 г. Ліда атрымала магдэбургскае права.

У часы панавання караля польскага і вялікага князя літоўскага Яна Казіміра (1648—1668 гг.) у горадзе налічвалася каля 15 тыс. жыхароў. На той час замак з усходу прыкрывала штучнае возера. Яно ёсць на планах і малюнках XVIII—XIX стст.

Гісторыкі XIX ст. сцвярджаюць, што ў 1638 г. гараджане атрымалі дазвол пабудаваць унутры замка склеп для захоўвання земскіх актавых кніг. Трэба аднак зазначыць, што пры археалагічных даследаваннях рэшткі склепа выявіць не ўдалося. Магчыма, што яго не было, а архіў месціўся ў вежах. Да канца XVIII ст. у замку адбываліся гродскія суды.

Замак з'яўляўся дзяржаўнай маёмасцю. Тут знаходзіліся склады зброі, стаяў гарнізон, у паўночнаўсходняй вежы была турма. Воіны гарнізона жылі ў драўляных казармах, прыбудаваных да каменных замкавых муроў. Жылыя будынкі ў асноўным мелі форму выцягнутых прамавугольнікаў, падзеленых перагародкамі на асобныя памяшканні. У кожным пакоі стаяла кафляная печ. Пад час шматлікіх аблог замка і пажараў драўляныя пабудовы гарэлі, а печы разбураліся. Але насельнікі замка зноў аднаўлялі сваё жыллё на старых каменных падмурках.

Пра побыт насельнікаў Лідскага замка ў XVI—XVII стст. расказваюць знаходкі археолагаў — вялікая колькасць кафлі, кухоннага і сталовага керамічнага посуду, вырабаў з металу, каменю і косці. Асабліва ўражвае пячная кафля, якой было знойдзена некалькі тысяч фрагментаў.

Поды печаў, зробленыя з гліны, невялікіх камянёў і бітай цэглы, захаваліся. Тут жа сабрана мноства гаршковай і каробкавай кафлі, што дазваляе прааналізаваць яе паступовае развіццё, а па іншых археалагічных матэрыялах, напрыклад, манетах, вызначыць час існавання таго ці іншага тыпу альбо варыянту кафлі. Пасля рэстаўрацыі даследчыкі змаглі выдзеліць два віды і каля трыццаці разнавіднасцей лідскай кафлі, з якой выкладалася асноўная паверхня печаў.

За гады раскопак у Лідскім замку была сабрана і ўжо часткова адноўлена вялікая колькасць кухоннага і сталовага посуду. Асартымент непаліваных вырабаў паўсядзённага ўжытку, якія адносяцца да XIV—XV стст., небагаты. Гэта гаршкі з накрыўкамі, патэльні і цёрлы. Посуд мае розныя памеры — ад 0,2 да 8 літраў і больш. Ён прыцягвае ўвагу сваёй зручнасцю, прапарцыянальнасцю. Гліняная паверхня яго крыху грубаватая, часам мае дэкор у выглядзе прамых ці хвалістых ліній.

Знаходкі, якія датуюцца XVI ст., прадстаўлены значнай колькасцю відаў ганчарных вырабаў. У гэты час з'яўляецца сталовы кухонны посуд, пакрыты зялёнай альбо карычневай палівай. Гэта латкі, міскі, рынкі, патэльні, збаны. Талеркі, новыя формы місак і паўмісак, стопкі, кубкі, куфлі, спецыяльныя начынні для прыпраў і парфумы, гліняныя скарбонкі, фляжкі выраблены ў XVI—XVII ст. Пры нанясенні дэкору майстры скарыстоўвалі штамп з малюнкам у выглядзе ромбікаў, што дазваляла атрымліваць арнаменты, характэрныя для традыцыйнага беларускага прыкладнога мастацтва. Некаторыя талеркі і паўміскі аздабляліся роспісам. Малюнак з адвольным сюжэтам наносіўся па гатоваму контуру. Пасля абпалу выраб пакрываўся бясколернай ці злёгку падфарбаванай палівай і зноў абпальваўся.

Пачынаючы з часоў вялікага князя літоўскага Аляксандра шляхта ВКЛ пачынае запазычваць элементы польскай шляхецкай культуры. Сярод керамічнага посуду польскай вытворчасці дамінуе белагліняная паліваная кераміка. Сярод знаходак у Лідскім замку яна складае каля 12%, што значна болей, чым выяўлена археолагамі на тэрыторыі іншых беларускіх замкаў. Выключэннем з'яўляецца толькі Мірскі замак. Тут знайшлі 1 119 фрагментаў посуду польскай вытворчасці, што складае 20% ад усяго знойдзенага глiнянага посуду. Датуецца польская кераміка XVI—пачаткам XVII ст.

Археолагамі знойдзены і цыліндрычныя шкляніцы на паддонах, аздобленыя дзвюма альбо трыма шклянымі стужкамі, шарападобныя флаконы XVII ст., упрыгожаныя па гарызанталі і вертыкалі шклянымі жгутамі, келіхі на масіўных ножках, кілішкі канічнай формы і адвольна фармаваныя стопкі з бясколернага шкла. Дапаўняюць калекцыю посуду кварты і бутэлькі, у якіх захоўваліся вадкасці. Кварты трапляюцца таўстасценныя, з зялёнага шкла, альбо танкасценныя, фармаваныя са шкла асветленага.

Сабрана шмат вырабаў лідскіх рамеснікаў: нажы, чаранковыя альбо з прыкляпанымі драўлянымі ці касцянымі накладкамі, нажніцы, круглыя і трохвугольныя вісячыя замкі, ключы, крэсівы, спражкі, сякеры, завесы, прабоі, вугалкі, каваныя цвікі розных памераў, падковы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да цікавых знаходак можна аднесці варган (музычны інструмент, які яшчэ называлі дрымбай) і кавалак гранёнага злітка, магчыма, свінцовага, з выявай "трызубца". У адной з нішаў паўночна-заходняй вежы замка адшуканы металічны сасуд з акруглым донцам, двума вушкамі і прымацаванай накрыўкай. Не выключана, што гэта парахаўніца.

Даследчыкі выявілі падчас раскопак і некалькі дзесяткаў сярэбраных і медных манет. Самымі раннімі з'яўляюцца дзве манеты часоў Кейстута і Вітаўта. Яны датуюцца XIV ст. і былі знойдзены ў паўночна-ўсходняй вежы. Пры расчыстцы адной з пабудоў каля паўночнага замкавага мура выяўлены 5 манет. Гэта грош Жыгімонта Аўгуста (1536 г.), венгерскі дынарый Максіміліяна II (1566 г.), солід (шылінг) Стафана Баторыя (1582 г.) і два соліды Жыгімонта Вазы (1610 г.).

У замкавым двары выяўлены некалькі дзесяткаў гліняных грузіл для рыбалоўных сетак, вялікая жалезная блясна з кручком, шмат костак дзікіх жывёл, у тым ліку рогі зубра — доказ таго, што насельнікі замка займаліся рыбалоўствам і паляваннем. У вольны час яны магчыма сядзелі за шахматнай дошкай, аб чым сведчаць знаходкі касцяных шахматных фігур XIV—XVI стст.

Пра развітыя гандлёвыя сувязі жыхароў Ліды расказваюць знаходкі іншаземных рэчаў. Гэта кавалак фаянсавага блюда, у аснову роспісу якога пакладзены сюжэт з біблейскага міфа пра Лаакаона. На адваротным баку блюда часткова захаваўся надпіс па-лацінску. Няма сумнення, што гэта італьянская маёліка.

На тэрыторыі замкавага двара адшуканы таксама два кавалкі вялікага сасуда, зробленага ў Паўднёвай Германіі ў XVII ст. Пакрыты празрыстай салянай глазурай і аздоблены барэльефам у выглядзе галавы льва, ён адносіцца да так званай рэйнскай керамікі. Такія багатыя археалагічныя знаходкі сведчаць пра дабрабыт насельнікаў замка.

У сярэдзіне XVII—пачатку XVIII ст. мірнае жыццё жыхароў Ліды было перапынена войнамі. Летам 1659 г. замак быў узяты ў аблогу 30-тысячным войскам маскоўскага ваяводы Хаванскага. Пасля працяглай асады і гарматнага абстрэлу замак быў захоплены. Усе драўляныя будынкі былі спалены (і больш ужо не аднаўляліся), а калодзежы засыпаны. Пасля заканчэння вайны на тэрыторыі замка ніхто пастаянна не жыў.

Моцны ўдар лідскім мурам нанеслі і шведы падчас Паўночнай вайны (1700—1721 гг.). Яны ў пачатку XVIII ст. узарвалі абедзве вежы, у выніку чаго замак страціў сваё абарончае значэнне. Муры замка паступова пачалі разбурацца. Аднак ва ўцалелых памяшканнях захоўваліся гарадскія акты і праходзілі суды.

Летам 1794 г. у яго руінах вялі бой з царскім войскам паўстанцы Тадэвуша Касцюшкі, узброеныя 18 гарматамі. Гарадскі архіў з усімі старажытнымі дакументамі быў вывезены з замка ў Смаленск, дзе падчас Айчыннай вайны 1812 г. згарэў.

Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай Ліда 8 жніўня 1796 г. стала павятовым цэнтрам Слонімскай губерні Расійскай імперыі.

Трэба адзначыць, што нават у канцы XVIII—пачатку XIX ст. замак уражваў сучаснікаў сваёй магутнасцю. Яшчэ захоўваліся замкавыя муры з байніцамі і аркатурным поясам на паўночнай і ўсходняй сценах, рэшткі вежаў. Менавіта з гэтага часу пачалося навуковае даследаванне помніка, да нас дайшлі яго першыя замалёўкі і апісанні.



*Руіны Лідскага замка.*
Фота пачатку XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




*Выгляд замчышча з паўднёва-ўсходняга боку. Малюнак Я.Драздовіча.* 1929 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У канцы XVIII ст. умацаванне замаляваў вядомы мастак Юзаф Пешка. На яго акварэлі бачна штучнае возера каля руін замка, на поўнач ад муроў — будынак касцёла, узведзенага ў 1770 г. на месцы старога драўлянага. Гарадской забудовы вакол замка яшчэ няма.

У канцы XX ст. літоўскія гісторыкі архітэктуры перадалі беларускім калегам тры новыя, яшчэ не ўведзеныя ў навуковы ўжытак малюнкі з выявай Лідскага замка. На адным з іх ёсць дата 1825 г. Каштоўнасць гэтых замалёвак надзвычай вялікая, бо на іх можна заўважыць асобныя архітэктурныя дэталі помніка. Акрамя выразна акрэсленага аркатурнага пояса на паўночна-ўсходняй вежы з боку горада на ніжніх паверхах паказаны шырокія вокны-байніцы арачнай формы, падобныя да тых, што калісьці асвятлялі княжацкую вежу Крэўскага замка. З усходу ніжнія паверхі вежы былі без акон, а акно-байніца на ўзроўні трэцяга альбо чацвёртага паверха выходзіла на балкон.

У першай палове XIX ст. замак з паўднёва-заходняга боку малявалі вядомыя жывапісцы В.Дмахоўскі і В.Гразноў. Найбольшай дакладнасцю вызначаецца малюнак Васіля Гразнова, дзе паказаны асобныя дэталі забудовы, у тым ліку і адзін з данскераў на ўсходняй сцяне. На той час рэшткі вежаў ужо былі ніжэйшыя, а штучнае возера зарастала чаротам.

Лідскі замак цікавіў і мясцовых гісторыкаў. Для вывучэння помніка шмат зрабіў Тэадор Нарбут, які нарадзіўся непадалёку ад Ліды ў маёнтку Шаўры (зараз Воранаўскі раён Гродзенскай вобласці). Аўтар шматтомнай "Гісторыі літоўскага народа" ў сваіх краязнаўчых работах прыводзіць шмат каштоўных звестак па гісторыі Ліды і замка.

Вучоны меў магчымасць карыстацца вялікай колькасцю архіўных матэрыялаў, якія да нашага часу не захаваліся. Заснаванне Ліды Т.Нарбут адносіў да 1180 г., аднак археалагічныя раскопкі на тэрыторыі горада і замка не пацвердзілі гэту дату. Самыя раннія знаходкі можна аднесці толькі да XIV ст. Не апраўдаліся таксама меркаванні тых гісторыкаў XIX ст., якія лічылі, што на месцы замка раней было паселішча.

Нарбут даследаваў руіны ўмацавання і пакінуў звесткі, што ў адной з кутніх вежаў былі шыкоўныя залы і пакоі на верхнім паверсе, на ніжнім — судовая і архіўная "ізбы", а таксама турма.

У сярэдзіне XIX ст. абмеры і замалёўкі лідскіх муроў выканалі рускія вучоныя. Іх матэрыялы захаваліся ў архіве Акадэміі мастацтваў у Санкт-Пецярбургу. У гэты час замалёўкі руін замка зрабіў Напалеон Орда. Краявід вакол замка змяніўся: возера амаль перасохла, а гарадская забудова падступіла бліжэй да ўмацавання. Малюнак Н.Орды выкананы ў папулярным тады стылі рамантызму, што значна сказіла сапраўдныя абрысы замка. Так, паўночна-ўсходняя вежа паказана круглай і выступаючай за лінію муроў, чаго ў сапраўднасці не было. Недакладна паказаны і верхнія часткі сцен.

Канец XIX ст. стаў для замка трагічным. У 1891 г. Ліда згарэла, прычым агонь знішчыў яе цэнтр разам з будынкам ратушы, узведзеным у XVIII ст. Мясцовыя ўлады, каб атрымаць матэрыялы для адбудовы горада, наладзілі разборку муроў і распрадажу атрыманых такім чынам матэрыялаў. З адхонаў замкавага пагорка сталі браць пясок. Былі амаль цалкам разабраны рэшткі паўднёва-заходняй вежы і частка заходняй сцяны. Толькі ўмяшанне імпе-

ратарскай археалагічнай камісіі з Пецярбурга спыніла канчатковае разбурэнне.

У канцы XIX ст. былі зроблены і першыя фотаздымкі Лідскага замка, якія аздобілі некаторыя тагачасныя паштоўкі. (Шмат відаў замка з розных бакоў захоўваецца зараз у рукапісным аддзеле бібліятэкі Вільнюскага універсітэта.) Параўноўваючы іх з выявамі замка, зробленымі ў папярэднія гады, можна заўважыць, што разбурэнне муроў прадаўжалася. На адным са здымкаў бачны разбураны паўднёва-ўсходні вугал умацавання. У 1908—1910 гг. замак вывучаў вядомы рускі рэстаўратар Пётр Пакрышкін. Ён зрабіў абмеры муроў і іх здымкі.

У пачатку XX ст. гісторыяй замка цікавіўся М.Шымялевіч. У 1906 г. у зборніку "Віленскі каляндар" ён надрукаваў артыкул "Горад Ліда і Лідскі замак".

У 1909 г. для кансервацыі рэшткаў замка былі адпушчаны невялікія сродкі — 943 рублі. Будаўнікі разабралі ненадзейныя месцы муроў, а паверхні сцен абмазалі цэментнай рошчынай. Сучаснікі адзначалі дрэнную якасць кансервацыйных работ. У 1911 г. беларускі археолаг Вандалін Шукевіч пісаў, што будаўнікі замуравалі байніцы на паўночнай сцяне, а цэментная нашлёпка на сценах стала прыцягваць вільгаць, што разбурала вонкавую паверхню муроў. У час Першай сусветнай вайны, а таксама рэвалюцыі і грамадзянскай вайны замак не быў пашкоджаны.

У 1920-я гг., калі паводле Рыжскага дагавора Заходняя Беларусь апынулася ў складзе Польшчы, лідскія муры крыху паднавілі польскія рэстаўратары. Яны злучылі каменнай агароджай заходнюю і паўднёвую сцены, часткова залажылі разбураны паўднёва-ўсходні вугал і замуравалі бакавыя ўваходы. На месцы разбуранага паўночна-заходняга кута з'явіліся драўляныя вароты, праз якія можна было трапіць у двор замка. Летам тут часта спыняліся вандроўны цырк альбо звярынец, а зімой пасярэдзіне двара ставілі елку і залівалі каток .

Летам 1929 г. замак наведаў вядомы беларускі мастак Язэп Драздовіч і зрабіў шэраг замалёвак. Самыя якасныя з іх "Выгляд замчышча з паўднёва-заходняга боку" і "Паўночна-заходняя сцяна замка". На першым малюнку можна ўбачыць старажытнае мураванае ўмацаванне, якое пануе над мясцовасцю. Паказана паўночная сцяна замка з цікавым пярэднім планам. На ўзгорку пры замкавым муры ўзнялі кроны дзве старыя сасны. Унізе, каля дарогі, стаіць студня з адмысловай страхой.

У верасні 1939 г. Заходняя Беларусь уз'ядналася з БССР. 22 студзеня 1940 г. урад рэспублікі прыняў пастанову аб ахове помнікаў рэвалюцыі, мастацтва, старажытнасці і захаванні архіваў у заходніх абласцях БССР. Лідскі замак атрымаў статус помніка архітэктуры.

У чэрвені 1941 г. на Ліду пасыпаліся фашысцкія бомбы. Мясцовыя жыхары расказвалі, што, заняўшы горад, захопнікі спачатку трымалі ў замку ваеннапалонных, а потым зрабілі там склады боепрыпасаў. У 1944 г., калі вораг ужо адступаў на захад, тут неаднойчы ўзрываліся снарады, але сцен умацавання яны не пашкодзілі. Калі ж савецкія войскі вызвалілі горад, то замкавы двор увесь быў пакрыты глыбокімі варонкамі, паўсюль валяліся снарады і міны. Даволі многа іх ляжала ў ямах, засыпаных зямлёй. З гэтымі "падарункамі" апошняй вайны і сутыкнуліся пазней археолагі. Не раз ім даводзілася спыняць раскопкі і выклікаць сапёраў. Так, у 1978 г. было знойдзена 150 снарадаў і 8 мінамётных мін, шмат патронаў і ўзрывальнікаў. Яшчэ большую колькасць снарадаў паднялі з зямлі ў 1986 г. Толькі ў адным з катлаванаў іх налічылі з паўтысячы. Прыйшлося на цэлы месяц прыпыніць раскопкі і рэстаўрацыйныя работы.

Пасля вайны на архітэктурныя вартасці замка звярталі ўвагу многія даследчыкі. Адзін з першых пасляваенных навуковых артыкулаў, прысвечаных гэтаму помніку, быў напісаны А.Палеесам у 1947 г. і надрукаваны ў часопісе "Беларусь". У 1953 г. Лідскі замак увайшоў у спіс помнікаў архітэктуры БССР, якія былі ўзяты пад ахову дзяржавы.

Калі ў верасні 1967 г. ЦК КПБ і Савет Міністраў БССР прынялі Пастанову аб правядзенні неадкладных рамонтна-рэстаўрацыйных работ на помніках гісторыі і архітэктуры, то руіны лідскіх муроў трапілі ў гэты дакумент пад нумарам 13.

У 1967 г. рашэннем мясцовых улад Лідскі замак перададзены пад шэфскі нагляд будаўнічаму трэсту № 19 і там былі абсталяваны спартыўныя пляцоўкі, падведзена вада і некалькі зім заліваўся каток. У 1970 г. была зроблена спроба ўмацаваць муроўку з-за пастаянных абвалаў вуглоў сцен, што было даручана будаўнічаму трэсту № 19.

У пасляваенны час сістэматычныя археалагічныя даследаванні ў замку пачаліся ў 1970 г. пад кіраўніцтвам Міхася Ткачова. Каля вежаў замка заклалі шурфы. Высветлілася, што паўднёва-заходняя вежа была пабудавана ў больш ранні час. Ад яе часткова захаваўся падмурак таўшчынёй тры метры. Ткачоў выказаў меркаванне, што другая вежа была ўзведзена альбо пасля 1384 г., альбо на мяжы XIV—XV стст. Яго датаванне пацвердзілася ў выніку далейшых даследаванняў. Вучоны таксама прасачыў, што ўмацаваная забудова стаіць на выспе са жвіру, пяску і камення.

У 1972 г. на адной з сесій Гродзенскага абласнога савета народных дэпутатаў было ўзнята пытанне аб аднаўленні замка і зроблена абгрунтаванне гэтай прапановы. Яе падтрымаў тагачасны старшыня аблвыканкама Р. Фамічоў. Але неабходных сродкаў не знайшлося.

У 1974 г. на тэрыторыі замка 12 невялікіх шурфоў заклаў Яраслаў Звяруга. Але ва ўсіх шурфах, зробленых па перыметру сцен на адлегласці 10 метраў ад іх, знаходзіўся перамешаны культурны слой, што рабіла навуковыя даследаванні немагчымымі.

... Ішоў час. З кожным годам прыгажэла Ліда. На яе вуліцах адзін за адным выраслі шматпавярхо-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

выя жылыя дамы. Побач з замкам узнялася дзевяціпавярховая гасцініца, крыху далей — высотны гмах інтэрната для будаўнікоў.

На фоне новай забудовы сумна выглядалі замкавыя муры. Заходняя сцяна нахілілася ў бок дарогі. На замкавым двары "гаспадарыў" будаўнічы трэст, які прыстасаваў яго пад свой стадыён. Помнік у цэнтры вялікага горада трэба было ратаваць.

Першы заказ ад Лідскага гарвыканкама на кансервацыю муроў прыйшоў у Спецыяльныя навукова-рэстаўрацыйныя майстэрні Міністэрства культуры БССР у 1975 г. Закладзеныя ў верасні 1976 г. архітэктурна-археалагічныя шурфы, а таксама даследаванне пісьмовых крыніц паказалі ўнікальнасць гэтага шэдэўра беларускага дойлідства. Навуковы кіраўнік рэстаўрацыйных работ архітэктар Сяргей Багласаў прапанаваў свой варыянт поўнай адбудовы замка і прыстасавання яго для сучасных культурных патрэб горада. Праект быў абмеркаваны і зацверджаны на пасяджэнні Лідскага гаркама КПБ і гарвыканкама. Рэспубліканскія ўлады выдаткавалі пэўныя грашовыя сродкі.

Аднак каб распрацаваць дэталёвы праект рэстаўрацыі, тых звестак, якія сабралі гісторыкі, не хапала. Патрабаваліся грунтоўныя археалагічныя даследаванні. У 1977—1978, а таксама ў 1980 і 1985 гг. іх праводзіў аўтар артыкула. У 1977 г. былі цалкам ускрыты рэшткі абедзвюх вежаў, знойдзены фрагменты некаторых драўляных пабудоў на замкавым двары, вызначана месца, адкуль пачынаўся роў перад паўночнай замкавай сцяной. Усе археалагічныя і рэстаўрацыйныя работы выконвалі студэнты будаўнічага атрада імя У.І.Пічэты (першага рэктара БДУ), сфарміраванага на гістарычным факультэце універсітэта. Будучыя гісторыкі працавалі самааддана. Асабліва цяжка даваліся раскопкі паўночна-ўсходняй вежы, рэшткі якой былі завалены вялізнымі валунамі. Тысячы камянёў вынесла адтуль за два месяцы брыгада студэнтаў з сямі чалавек.

У 1978 і 1980 гг. пры расчыстцы рэшткаў асноўных пабудоў на замкавым двары адкапаны два калодзежы. Вывучэнне культурнага слоя двара пазней (у 1986—1987 гг.) прадоўжыў Алесь Краўцэвіч. Ён выявіў рэшткі падмуркаў драўлянага будынка, што стаяў асобна ў паўночнай частцы замка. У выніку раскопак было знойдзена шмат каштоўных матэрыялаў, якія ляглі ў аснову праекта аднаўлення Лідскага замка.

Летам 1978 г. для правядзення рэстаўрацыйных работ быў створаны вытворчы ўчастак. Сюды прыйшлі мясцовыя рабочыя, узначаліў іх майстар Іосіф Мацейка. Амаль кожны дзень, нягледзячы на сваю занятасць, заходзіў у замак Уладзімір Логаш, які тады быў старшынёй гарвыканкама. Не раз дапамагаў ён тэхнікай, звяртаўся на заводы будаўнічых матэрыялаў Літвы за спецыяльнай вялікапамернай цэглай і хвалістай дахоўкай. І справа пайшла. Адзін за другім аднаўляліся колішнія муры. Першай над сценамі замка ўзнялася паўночна-ўсходняя вежа. Яе ўпрыгожыў флюгер з выявай герба ВКЛ — "Пагоня".

Вялікую цікавасць выклікала рэстаўрацыя замка ў гараджан. На вуліцы былі выстаўлены малюнкі праекта аднаўлення помніка. Спецыяльна была наладжана экскурсія для начальнікаў цэхаў і кіраўнікоў аддзелаў завода "Лідсельмаш", пасля чаго прадпрыемства аказвала дапамогу ў яго аднаўленні. Да работ па рэстаўрацыі далучылася Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі БССР. Па загаду міністра А.Бязлюдава ў горад прыбыла група з дзесяці чалавек для распрацоўкі праекта добраўпарадкавання тэрыторыі вакол замка. Значны ўклад у гэту справу тады ўнёс галоўны архітэктар горада Анатоль Пархута.

Непазнавальна змянілася і тэрыторыя вакол замка. З паўночнага боку раскінулася вялікая плошча, самая прыгожая ў горадзе. Спынены рух цяжкавагавага транспарту каля заходняй сцяны замка. Каб захаваць паступовы пераход ад сучаснай высотнай забудовы да помніка XIV ст., перад замкам пакінулі тры мураваныя невялікія двухпавярховыя дамы канца XIX—пачатку XX ст.

Не абышлося і без памылак. Вясной 1986 г. раптоўна абваліўся кавалак аднаўленай заходняй сцяны. Майстар І.Мацейка лічыць, што на разбурэнне магло паўплываць будаўніцтва інтэрната будтрэста № 19 непадалёк ад замка, што выклікала значную вібрацыю. Адзначалася і тое, што ў савецкі час каля Ліды размяшчалася ваенная авіяцыйная база, і некаторыя знішчальнікі пераадольвалі гукавы бар'ер непасрэдна над замкавымі мурамі. Некаторыя ўскладаюць віну на будаўнікоў. Як высветлілася, работы па рэстаўрацыі вяліся ў зімовыя маразы, і рошчына не змацавала каменні належным чынам.

Рэстаўратары працавалі над знойдзенымі археалагічнымі экспанатамі. Частку металічных вырабаў расчысціў і закансерваваў Я.Улезла, мастацтвазнаўца М.Яніцкая зрабіла графічныя рэканструкцыі шклянога начыння, а студэнты кафедры керамікі Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута пад кіраўніцтвам выкладчыка У.Угрыновіча аднавілі вялікую колькасць кафлі і рознага посуду.

На той час меркавалася, што аднаўленне замка будзе завершана да 1985 г. Тэрыторыю замкавага двара планавалася прыстасаваць пад гісторыка-археалагічны музей з паказам на мясцовасці планаў былой драўлянай забудовы. У цэнтральнай частцы замка хацелі размясціць адкрыты гарадскі тэатр, дзе летам можна было б праводзіць фестывалі і гарадскія святы.

На жаль, рэстаўрацыйныя работы не былі завершаны і спыніліся з-за недахопу фінансавання ў сярэдзіне 1990-х гг. Лідскі замак стаяў фактычна бясгаспадарчым і не закансерваваным, таму многае з таго, што было зроблена ў 1970—1980-я гг., было разбурана, ніякіх работ па яго захаванню не праводзілася.

Толькі ў 2001 г. на рэспубліканскім узроўні было прынята рашэнне аб распрацоўцы праекта правядзення першачарговых проціаварыйных работ у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

замку (разборка аварыйнай сцяны і адной з вежаў, кансервацыя пэўных частак). Праект падрыхтавалі ў 2003 г., але сродкаў на яго ажыццяўленне не знайшлі.

Цяпер рэстаўрацыя Лідскага замка прадаўжаецца. У маі 2006 г. падрыхтавана праектна-каштарысная дакументацыя другога этапа рэканструкцыі Лідскага замка. Праектаваннем рэканструкцыі займаецца УП "Мінскпраект". Зменены падрадчык, які павінен весці разборку аварыйных участкаў сцен і выконваць рэстаўрацыйныя работы. Зараз гэтым займаецца Лідскі будтрэст № 19. У Лідзе быў створаны пазабюджэтны фонд для назапашвання сродкаў на рэстаўрацыю замка і адкрыты спецыяльны рахунак у філіяле 413 АСБ "Беларусбанк" у Лідзе. Кожны жадаючы мог аказаць пасільную грашовую дапамогу ў справе аднаўлення замка.

На сённяшні дзень разабраны аварыйныя сцяна і вежа, праводзяцца работы па добраўпарадкаванню прылеглай тэрыторыі. На дадзеныя работы затрачана 60 млн рублёў, якія паступілі на рахунак пазабюджэтнага фонду захавання культурнай спадчыны Лідчыны. З абласнога бюджэта выдзелена 200 млн рублёў.

Не пакідаюць без увагі замак і розныя грамадскія арганізацыі. Так, Міністэрства культуры задаволіла просьбу кіраўніцтва грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" і для правядзення работ па аднаўленню помніка выдзеліла 100 млн рублёў з рэспубліканскага бюджэта.

17—18 верасня 2005 г. у Лідзе прайшоў Міжнародны фестываль сярэдневяковай культуры "Замак Гедзіміна". Арганізатары гэтага мерапрыемства, Рэспубліканскае грамадскае маладзёжнае аб'яднанне "Рыцары Вялікага Княства" і Лідскі райвыканкам, хацелі прыцягнуць увагу да праблемы рэстаўрацыі Лідскага замка. Асаблівасць фестывалю ў правядзенні коннага і двух пешых рыцарскіх турніраў, а таксама турніру лучнікаў. У фестывалі прымалі ўдзел не толькі беларускія рыцарскія клубы, але і клубы з Расіі, Украіны, Польшчы, краін Балтыі. Было зарэгістравана 500 удзельнікаў. Па ацэнцы арганізатараў, за два дні фестывалю ў замку пабывала 10 тысяч гледачоў. Сродкі, атрыманыя ад яго правядзення, былі накіраваны на рэканструкцыю Лідскага замка.

Пасля правядзення Міжнароднага фестывалю Лідскі замак пачаў жыць і функцыяніраваць як турыстычны аб'ект. Пасля рыцарскага турніру тут быў наведзены парадак, і супрацоўнікі Лідскага гістарычна-мастацкага музея прыступілі да экскурсійнага абслугоўвання замка. У лістападзе 2005 г. ля ўязной брамы замка прымацавана ахоўная дошка, на якой напісана "Гісторыка-культурная каштоўнасць. Замак XIV ст. Прычыненне шкоды караецца па закону".

19—20 мая 2007 г. у Лідскім замку праходзіў фестываль рыцарскіх баёў "Меч Лідскага замка". На



*Турнір конных рыцараў на замкавым двары.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Рыцары ў Лідскім замку на фоне паўночна-ўсходняй вежы.* Фота І. Пешахонава. 2005 г.

кожны сеанс збіралася некалькі тысяч чалавек. Гледачоў на замкавы двор пускалі па дзве тысячы, а за сценамі адпачывалі, гулялі тысячы жыхароў і гасцей Ліды. Працаваў горад майстроў, на сцэнічнай пляцоўцы гучалі песні і музыка. У жніўні 2007 г. праз замак прайшоў трэці Беларускі аўтакруіз "Замкавая Беларусь — сувязь часоў і пакаленняў".

1 чэрвеня 2008 г. у Лідскім замку адбылася прэм'ера анімацыйнага спектакля "Суд Кейстута". Спектакль падрыхтаваны Лідскай турыстычнай фірмай "Святавіт" і Лідскім рыцарскім клубам "Дайнава".

Цяпер вучоныя і архітэктары вядуць дыскусіі аб тым, якім будзе ўнутраны двор замка. Гэтае пытанне абмяркоўвалі на навукова-метадычным савеце ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры. Спрачаліся не аб рэстаўрацыі замкавага двара, а аб канцэпцыі выкарыстання замка як архітэктурнага помніка.

Адзін з варыянтаў, які прапаноўваюць рэстаўратары, — узнавіць двор як гістарычны комплекс: з казармамі і домам каменданта. Ёсць прапановы зрабіць замак пляцоўкай для правядзення фестываляў сярэдневяковай культуры. Выказваюцца ідэі перадаць адну з вежаў піваварам. Архітэктары-рэстаўратары, хоць і прызнаюць рацыянальнасць прапаноў, але перасцерагаюць ад празмернага захаплення масавымі мерапрыемствамі. Для таго каб пусціць у замак вялікую колькасць гледачоў, трэба ствараць у адпаведнасці з патрабаваннямі МНС дадатковы выхад.

Плануецца, што на першым паверсе вежы будзе размешчана экспазіцыя з прадметаў, знойдзеных падчас археалагічных раскопак у Лідзе. Па замку можна будзе праводзіць экскурсіі, наладжваць у ім канцэрты. Ужо ўзнавілася традыцыя заліваць у замкавым двары каток у зімовы час.

Цяпер рыхтуецца новы праект турыстычнага выкарыстання Лідскага замка. Ён распрацоўваецца і ажыццяўляецца мясцовымі краязнаўчым музеем сумесна з лідскай турыстычнай фірмай "Святавіт". У новую праграму плануецца ўключыць экскурсію па замку і знаёмства з экспазіцыяй у вежы Вітаўта. Турыстам будзе прапанавана стаць гледачамі тэатралізаванага прадстаўлення з удзелам членаў лідскіх рыцарскіх клубаў, фрагмент тэатралізаванага вяселля Ягайлы і Соф'і Гальшанскай. Акрамя таго, жадаючыя будуць мець магчымасць пастраляць з лука, прымерыць рыцарскія даспехі, сфатаграфавацца.

Калі працы па рэстаўрацыі Лідскага замка будуць скончаны, а праекты па яго турыстычнаму выкарыстанню ажыццёўлены, то гісторыя замка будзе прадаўжацца, і ён стане прывабным месцам для айчыннага і замежнага турызму.

**Літаратура**


Narbutt T. Dzeje Narodu Litewskego. T. IV. Wilno, 1839. S. 518—519.

Багласов С.Г., Трусов О.А. Историко-архитектурные исследования и реставрация Лидского замка // Вопросы архитектуры Лит. ССР. 1981. Вып. VII.

Ганецкая І.У. Маёліка на Беларусі ў XI—XVIII стст. Мн., 1995.

Гудавичюс Э. История Литвы с древнейших времен до 1569 года. Том 1. М., 2006.

Здановіч Н. Замкавая кераміка як адлюстраванне шляхецкай культуры Беларусі // Матэрыяльная і духоўная культура замкаў Беларусі. Мн., 2003.

Кузняцоў С. Адраджэнне замка // Звязда. 2005. 15 красавіка.

Кулагін А.Н. Абарончая архітэктура Беларусі X—XIV стст. у кантэксце славянскай і агульнаеўрапейскай гісторыі будаўнічай культуры // Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце. У 4 т. Т. 1. IX—XIV стст. Мн., 2005.

Тарас А.Е. Войны Московской Руси с Великим княжеством Литовским и Речью Посполитой в XIV—XVIII веках. Мн., 2006.

Ткачоў М.А. Лідскі замак // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. № 2. 1971.

Трусаў А.А. Старадаўніх мураў адраджэнне = Древних стен возрождение: Мінулае і сучаснасць Лідскага замка. Мн., 1990.

Цыганец В. Лідская крэпасць будзе жыць! // Культура. 2006. 21 студзеня.

Шемелевич М. Город Лида и Лидский замок // Виленский календарь. Вильно, 1906.

www.belorusiya.l
and.ru/lida
www.naviny.by
www.nawet.ru


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Мінулае і сучаснасць Лідскага замка

*(да матэрыялу на с. 21—32).*



*Від на горад са сцен Лідскага замка.*



*Агульны выгляд руін Лідскага замка.* Малюнак Я.Драздовіча. 1929 г.